# Гомельскі ўніверсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№10 (832) | Субота, 18 красавіка 1992 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 10 кап.


*19-га красавіка — Дзень савецкай навукі*

## ТАКСАМА Ў КРЫЗІСНЫХ ЦІСКАХ

Многія гады на ўсіх узроўнях сцвярджалася, што савецкая навука — адна з самых перадавых у свеце. Цяпер у гэтым можна усумніцца. Глыбокі сацыяльна-эканамічны крызіс, у якім апынуўся былы СССР, а зараз перажывае яго СНД, моцна закрануў і ўсю айчынную навуку. Тут нельга не спаслацца на выказванне на адной з прэс-канферэнцый былога міністра адукацыі, а цяпер намесніка Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. І. Дземчука. Яшчэ зусім нядаўна, гаварыў ён, наша ўяўленне пра навуку рэспублікі абмяжоўвалася рамкамі акадэмічнай і «вузаўскай». На самой справе гэта было далёка не так. Пасля рассакрэчвання сферы ваенна-прамысловага комплексу аказалася, што каля 70% навуковага патэнцыялу Беларусі знаходзілася менавіта там. І толькі астатнія 30 (па 15% на кожную) прыпадала на АН і ВНУ. Да таго ж наша рэспубліка ў навуковым забеспячэнні ВПК выконвала найбольш адказную ролю, бо абслугоўвала функцыяніраванне зборачнага канвеера складанай прадукцыі.

І вось сёння гэты патэнцыял амаль поўнасцю павіс у паветры. Адсутнасць заказаў і фінансавання з боку «абаронкі» і «космасу» стварылі патэнцыяльную пагрозу распаду структур галіновай навукі, што вельмі непажадана. Урадам прадпрымаюцца намаганні, каб не дапусціць яго, а скіраваць навуку ВПК на службу грамадскім інтарэсам.

Да слоў М. І. Дземчука цяжка дадаць штосьці новае. Можна толькі сказаць, што наша універсітэцкая навука таксама знаходзіцца ў моцных крызісных цісках. З-за недахопу сродкаў у заказчыкаў анулявана пераважная большасць гаспдагавораў. І толькі фізічны факультэт, як кажуць, застаецца на плыву. Тут вядуцца найбольш перспектыўныя навуковыя распрацоўкі. Яны выконваюцца ў асноўным у лабараторыі лазернай тэхналогіі, праблемнай навукова-даследчай лабараторыі фізіка-хімічных працэсаў трэння, якія ўзначальваюць А. Ц. Малашчанка і І. М. Мельнічэнка. У гэтых падраздзяленнях вядзецца плённая работа па стварэнню лазернай медыцынскай тэхнікі і новых тэхналагічных матэрыялаў на аснове керамікі.

Аб'ём дзяржбюджэтных і гаспдагаворных даследаванняў на сённяшні дзень вызначаны ў суме звыш 3 млн. 300 тыс. руб. Але ён можа быць і значна большым.

Вучоныя універсітэта імкнуцца ўнесці дастойны ўклад у вырашэнне праблем, звязаных з вынікамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Сёлета па Рэспубліканскай праграме «Чарнобыль» на навуковыя даследаванні універсітэту выдзелена 1 млн. 40 тыс. руб. Неабходна распрацаваць чатыры важныя тэмы, кіраўнікамі якіх з'яўляюцца прафесар Л. М. Сапегін і дацэнт І. П. Арабіна з біялагічнага факультэта, прафесар І. В. Максімей з матэматычнага і дацэнт В. Г. Жогла з геалагічнага факультэтаў. Значныя сродкі неабходна асвоіць на навуковыя даследаванні па праграме «Дзеці Чарнобыля» і па абласной праграме «Чарнобыль».

Больш паспяховаму правядзенню навуковых распрацовак павінен садзейнічаць навукова-тэхнічны цэнтр пры НДС, рашэнне аб адкрыцці якога прынята на вучоным савеце універсітэта.

Неабходна адзначыць і тое, што за апошні час значна пашырыліся міжнародныя навуковыя сувязі нашага універсітэта. Нядаўна, у прыватнасці, аўтар гэтых радкоў і ст. н. с., канд. фіз.-мат. навук Г. С. Міцюрыч удзельнічалі ў міжнародным кангрэсе ў ЗША. На навуковых стажыроўках цяпер знаходзяцца: дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі А. П. Кармазін — у Галандыі, загадчык кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства У. І. Коваль — у Кітаі.

Адным з самых адметных паказчыкаў росту навуковага патэнцыялу кожнай ВНУ з'яўляецца абарона доктарскіх дысертацый. У гэтым напрамку мы дасягнулі прыкметнага зруху. Толькі сёлета доктарскія дысертацыі абаранілі чатыры вучоныя ГДУ. Гэта дацэнты Я. С. Барыс і Ю. У. Малінкоўскі з матэматычнага, С. С. Гіргель і І. М. Мельнічэнка з фізічнага факультэтаў. Да канца года чакаецца абарона яшчэ прыкладна той жа колькасці доктарскіх дысертацый.

Бясспрэчна, цяпер мы перажываем нялёгкі час. Тым не менш ёсць падставы сцвярджаць, што і ў гэтых складаных умовах універсітэцкая навука будзе развівацца.

**А. СЕРДЗЮКОЎ,**
**прарэктар па навуковай рабоце, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар.**

## ЎСЁ РОЎНА ЗА ЦЭНАМІ НЕ ЎГНАЦЦА

**Няспынны рост цэн можа прывесці членаў нашага грамадства да жабрацкага існавання. У нейкай ступені прадухіліць гэта ўрад Рэспублікі Беларусь спрабуе шляхам павышэння зарплаты, стыпендый, размераў пенсій і дапамог на дзяцей. Чарговае іх павышэнне адбылося з 1 сакавіка бягучага года.**

**Работнікаў нашага універсітэта, студэнтаў цікавіць, якія зарплату і стыпендыі яны будуць цяпер атрымліваць. Адказ на гэта пытанне даюць начальнікі аддзелаў: планава-фінансавага — С. Я. ПАШУК і кадраў — Т. І. ОСІПАВА:**

— У адпаведнасці з пастановай Дзяржкамітэта Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва ад 29.02.92 г. «Аб пералічку тарыфных ставак і акладаў работнікаў прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, якія знаходзяцца на бюджэтным фінансаванні, зацверджаных пастановай Дзяржкампрацы ад 6 студзеня 1992 г.» з 1 сакавіка г. г. устаноўлены новыя аклады:

— для загадчыка кафедры — прафесара з вучонай ступенню доктара навук — 3348, без вучонай ступені доктара навук — 3036 руб.;

— для прафесара з вучонай ступенню доктара навук — 3036, без вучонай ступені доктара навук — 2754 руб.;

— для дацэнта з вучонай ступенню — 2496, без вучонай ступені — 2262 руб.;

— для старшага выкладчыка з вучонай ступенню —2262, без вучонай ступені — 2052 руб.;

— для асістэнта, выкладчыка з вучонай ступенню —1860, без вучонай ступені — 1686, для выкладчыка-стажора — 1530 руб.

Аклады старшых лабарантаў з вышэйшай адукацыяй, якія прымаюць удзел у вучэбным працэсе, — 1254 руб., лабарантаў — 912 руб.

У кіруючых работнікаў універсітэта пасадавыя аклады ўстаноўлены ў наступных размерах:

— рэктару — 4488 руб.; першаму прарэктару, прарэктару па вучэбнай рабоце — 4068 руб., прарэктару па навуковай рабоце — 3690 руб., прарэктару з вучоным званнем дацэнта, кандыдата навук — 3036 руб. Аклад начальнікаў аддзелаў — вучэбнага, кадраў, аспірантуры, тэхнічных сродкаў навучання, а таксама галоўнага механіка, галоўнага энергетыка — 1686 руб.

Будуць павялічаны размеры даплат у 1,5 раза: за работу ў неспрыяльных умовах працы; асобам, якія маюць ганаровае званне «заслужаны»; выкладчыкам за загадванне кафедрай, выкананне абавязкаў дэкана і нам. дэкана.

На прэміраванне выкладчыкаў за вучэбна-метадычную работу і ўстанаўленне надбавак за высокія дасягненні ў працы і выкананне асабліва важных (складаных) работ Міністэрствам адукацыі выдзяляюцца сродкі ў размеры да 5% планавага фонду зарплаты. Улічваючы той факт, што сродкі гэтыя нязначныя, надбаўкі ўстаноўлены толькі тым работнікам універсітэта, якія заняты на адказных, важных участках работы, маюць высокую кваліфікацыю.

Каб не ўскладняць работу інспектараў аддзела кадраў, просьба да ўсіх членаў універсітэцкага калектыву своечасова, у трохдзённы тэрмін, з'яўляцца ў аддзел кадраў для азнаямлення з загадам па павышэнню заработнай платы.

Вызначаны таксама новыя размеры стыпендый для студэнтаў, аспірантаў. Мінімальны размер стыпендыі складзе 440 руб. (замест 280 руб.). Студэнты, якія займаюцца на «добра» і «выдатна», будуць атрымліваць 500, на «выдатна» — 570 руб.

## БЕЗ ЗЯМЛІ І БЕЗ ПУЦЁВАК

### ЗАСТАНУЦЦА МНОГІЯ РАБОТНІКІ ГДУ

Наша жыццё ва ўмовах рынку з кожным днём становіцца ўсё больш складаным. Надзеі на выжыванне многія з нас звязваюць з атрыманнем кавалка зямлі, з якога можна было б пракарміцца, бо цэны на харчаванне, мякка кажучы, не выклікаюць аптымізму.

Шмат жадаючых мець зямельны ўчастак для дачнага будаўніцтва і садаводства ёсць і ў нашым універсітэце. Аб гэтым сведчыць тая колькасць заяў, што паступіла ў прафком ГДУ на атрыманне зямельнага надзелу. Па Закону аб зямлі, прынятым у нашай рэспубліцы, кожны грамадзянін мае права мець яе ў размеры 10 сотак і больш. На справе ж аказваецца, што атрымаць іх не так ужо і проста, як здаецца на першы погляд. Сельскія Саветы не надта ахвотна ідуць насустрач гараджанам, матывуючы гэта самымі разнастайнымі прычынамі.

З вясны мінулага года прафсаюзным камітэтам вялася работа па атрыманню зямлі пад дачныя ўчасткі для работнікаў ГДУ. У выніку універсітэту выдзелена зямельная плошча для 47-мі чалавек ва ўрочышчы «Чонкі» і в. Калініна. Яе падзел вёўся на факультэтах, у структурных падраздзяленнях прапарцыянальна пададзеным заявам, прычым, перавагу атрымлівалі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, ліквідатары чарнобыльскай аварыі, тыя, хто мае большы стаж работы ў ГДУ. На пасяджэнні прафкома, якое адбылося 8 красавіка, былі зацверджаны спісы тых, хто атрымаў дачныя ўчасткі. Канешне, незадаволеных, тых, хто не стаў шчаслівым уладальнікам зямельнага надзелу, засталося шмат. Іх спадзяванні на тое, што бульба, гародніна, садавіна, вырашчаныя ўласнымі рукамі, у многім пакрыюць іх грашовыя выдаткі, аказаліся марнымі. Што ж, многім да гэтага не прывыкаць, бо работнікаў вышэйшай школы як і раней, так і цяпер не надта балуюць у справе іх сацыяльнай абароны.

Невясёлы настрой можа выклікаць у пераважнай большасці членаў нашага калектыву яшчэ адна не вельмі радасная інфармацыя, з якой выступіў на пасяджэнні прафкома старшыня абкома прафсаюза работнікаў народнай адукацыі і навукі У. Я. Курылаў. Яна датычыцца аздараўлення выкладчыкаў, супрацоўнікаў і іх сем'яў у летні перыяд. Лічбы, як кажуць, рэч упартая, з імі не паспрачаешся. Вось яны: у мінулым годзе на 1000 працуючых галіновы прафсаюз змог выдзеліць 24 планавыя санаторныя пуцёўкі, цяпер жа, калі СССР разваліўся, а цэны шалёна ўзраслі літаральна на ўсё, з той жа тысячы членаў прафсаюза на лячэнне і аздараўленне па плану могуць прэтэндаваць толькі 11 чалавек. Ды і тыя не надта ўзрадуюцца, калі даведаюцца аб кошце пуцёвак. Самая танная з іх, напрыклад, у санаторый мясцовага значэння «Васільеўка» каштуе 3,5 тыс. руб. А цэны на пуцёўкі на поўдзень, Каўказ, Рыжскае ўзмор'е і г. д. будуць дасягаць нават 6—8 тыс. руб. А дадаць сюды білеты на дарогу, цана на якія яшчэ таксама можа падскочыць з-за павелічэння кошту энерганосьбітаў. Вось і лічыце... Дзе набярэшся сродкаў на такое аздараўленне? І нічога не застанецца, як сядзець улетку на сваім агародзе і даглядаць градкі з агуркамі і памідорамі. Дык і яго ж у многіх не будзе...

**Т. НІКАЛАЕВА.**

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры філасофіі віншуюць асістэнта **ГРУДНІЦКАГА** Мікалая Давыдавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філасофскіх навук.

*Справаздачу трымае выканкам Цэнтральнага райсавета*

**22 красавіка на чарговай сесіі народных дэпутатаў будзе заслухана і абмеркавана справаздача выканкама Цэнтральнага райсавета г. Гомеля «Аб праведзенай рабоце за перыяд з сакавіка 1991 года па сакавік 1992 года».**

**У справаздачы значнае месца займаюць аналіз вынікаў дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў раёна за 1991 год і прагнозы развіцця мясцовай народнай гаспадаркі на сёлета. Гэта, дарэчы, абмяркоўвалася на сесіі Цэнтральнага райсавета народных дэпутатаў 20 лютага г. г. і знайшло адлюстраванне ў матэрыяле «Стабілізацыя не прадбачыцца», які быў апублікаваны ў нашай газеце за 6 сакавіка 1992 г. Таму мы палічылі мэтазгодным не паўтарацца, а сканцэнтраваць увагу на тых аспектах, якія датычаць народнай адукацыі, медыцыны, культуры і іншых праблем, што стаяць найбольш востра ў нашым жыцці.**

# НА ЦЯЖКІМ РЫНАЧНЫМ ШЛЯХУ

У СПРАВАЗДАЧНЫ перыяд выканкам раённага Савета народных дэпутатаў пастаянна займаўся пытаннямі павышэння якасці вучэбна-выхаваўчага працэсу, развіцця агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы. У школах раёна праводзіліся адкрытыя ўрокі па вывучэнню лепшага вопыту настаўнікаў-наватараў. Гэта дазволіла значна ўзняць прафесійны ўзровень настаўнікаў, выхавальнікаў, кіраўнікоў школ і дзіцячых дашкольных устаноў. Па выніках атэстацыі вышэйшая катэгорыя прысвоена 65 настаўнікам, чатыром выхавальнікам, першая — 300 настаўнікам і 22 выхавальнікам. СШ № 24 (дырэктар Л. Р. Клімава) стала пераможцай гарадскога агляду-конкурсу «Лепшая школа 1991 года».

Важнае месца ў рабоце педкалектываў раёна займаюць пытанні, звязаныя з рэалізацыяй Закона аб мовах у нашай рэспубліцы. Гэта пытанне абмяркоўвалася на сесіі раённага Савета ў снежні 1991 г. Распрацаваны і зацверджаны мерапрыемствы па яго выкананню.

У верасні мінулага года адкрыты два першыя класы з навучаннем на беларускай мове ў СШ №№ 26, 56 і адна група ў дзіцячым садзе № 21. У шасці школах створаны этнаграфічныя музеі, а ў СШ №№ 11, 19, 56 — музеі нацыянальнай культуры. У большасці школ дакументацыя вядзецца на беларускай мове.

Побач з вырашэннем галоўнай задачы — павышэннем якасці вучэбна-выхаваўчага працэсу многае рабілася і для ўмацавання вучэбна-матэрыяльнай базы школ і дзіцячых дашкольных устаноў. На ўсіх аб'ектах быў праведзены бягучы рамонт, на што затрачана 1 млн. 230 тыс. руб. Школы і дашкольныя ўстановы даўкамплектаваны мэбляй і абсталяваннем на агульную суму каля паўмільёна рублёў. У харчовых блоках школ абноўлена халадзільнае і тэхналагічнае абсталяванне. Выдзелена 100 тыс. руб. для ўтварэння стыпендыяльнага фонду для дзяцей-сірот і інвалідаў, якія вучацца ў ВНУ, тэхнікумах, ПТВ і школах.

Выканкам райсавета працягваў работу па паляпшэнню сацыяльна-бытавых умоў настаўнікаў і сацыяльнай абароне ва ўмовах рынку. У мінулым годзе настаўнікам выдзелена 13 дзяржаўных кватэр і 13 сем'яў педработнікаў уключаны ў жыллёва-будаўнічыя кааператывы. У цяперашні час ідзе выдзяленне кватэр работнікам дзіцячых дашкольных устаноў. Маладыя спецыялісты, якім патрэбна жыллё, забяспечваюцца інтэрнатамі, кошт пражывання ў іх кампенсуецца з бюджэта раёна. Для настаўнікаў раёна арганізавана садоўніцкае таварыства ў саўгасе «Прыазёрны» Гомельскага раёна. У сувязі з лібералізацыяй цэн педработнікам выплачваецца кампенсацыя ў суме 160 руб штомесячна. Ў мінулым годзе аказана матэрыяльная дапамога ў памеры 100 руб. кожнаму настаўніку, а выязджаючым з дзецьмі на аздараўленне — па 200 руб. У бягучым годзе прынята рашэнне гэтыя сумы падвоіць.

Распрацавана і зацверджана палажэнне аб прэміраванні работнікаў дашкольных устаноў (у памеры 30% пасадавага акладу).

ВЫКАНКАМ раённага Савета народных дэпутатаў пастаянна ў полі зроку трымае пытанні аздараўлення ў сувязі са складаўшайся сітуацыяй пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

На працягу 1991 года было аздароўлена каля 7 тыс. навучэнцаў. Упершыню выязджалі на аздараўленне выхаванцы дашкольных устаноў — дзіцячых садоў № 16 і № 90. Захворваемасць дзяцей па раёну ў дашкольных установах знізілася ў два разы.

У 1991 годзе на бясплатную выдачу сокаў навучэнцам пачатковых класаў і частковую кампенсацыю па харчаванню зрасходавана 213 тыс. руб. У бягучым навучальным годзе арганізавана бясплатнае харчаванне навучэнцаў усіх школ. Па жаданню выплачваецца кампенсацыя за харчаванне ў памеры 10 руб. у дзень. На медабсталяванні, набытым для медсанчасці будаўнікоў, праведзена медыцынскае абследаванне дзяцей дашкольнага і школьнага ўзростаў раёна.

У гэтай сувязі выканкам прымаў меры па ўмацаванню матэрыяльнай базы ўстаноў аховы здароўя і паляпшэнню ўмоў іх працы. У 1991 г. на набыццё медыцынскага абсталявання для бальніцы хуткай дапамогі выдзелена 250 тыс. руб. Прынята рашэнне аб перадачы, пасля капітальнага рамонту жылога дома па вул. Камісарава, 2 пад інтэрнат для маласямейных і адзінокіх медыцынскіх работнікаў раёна. Выканкам райсавета мае намер і ў далейшым аказваць дапамогу і садзейнічанне ў развіцці аховы здароўя.

Асаблівая ўвага ўдзялялася рабоце па паляпшэнню сацыяльнага абслугоўвання і матэрыяльнага становішча інвалідаў і пенсіянераў, шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў.

На пасяджэннях выканкама, на дэпутацкіх камісіях у 1991 і 1992 г.г. разгледжаны пытанні: «Аб ходзе выканання Законаў «Аб пенсійным забеспячэнні грамадзян у СССР», «Аб пенсійным забеспячэнні ваеннаслужачых», «Аб ходзе выканання комплекснай праграмы «Апека», «Аб зацвярджэнні мерапрыемстваў выканкама па выкананню пастановы СМ Рэспублікі Беларусь № 492 ад 27.12.91 г. «Аб мерах па пашырэнню натуральнай дапамогі маламаёмным слаям насельніцтва».

У апошні час у аддзеле сацыяльнага забеспячэння значна ўзрос аб'ём працы ў сувязі з пераразлікам пенсій. У адпаведнасці з пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб неадкладных мерах, звязаных з пенсійным забеспячэннем грамадзян Рэспублікі Беларусь», са студзеня г. г. неабходна зрабіць пераразлік усіх пенсійных спраў. Шмат увагі ўдзяляецца таксама выдачы дапамог на дзяцей, бацькі якіх не працуюць, а таксама выдачы купонаў.

Выканкам райсавета шмат зрабіў для паляпшэння ўмоў працы работнікаў райсабеза; выдзелена асобнае памяшканне, устаноўлены дадатковыя тэлефоны, укамплектаваны мэбляй і аргтэхнікай. Для паскарэння назначэння і пераразлікаў пенсій, аблягчэння працы ў аддзел набыты камп'ютэр.

Цяпер у аддзеле сацзабеспячэння стаіць на ўліку 12,2 тыс. пенсіянераў, з іх 3630 працягваюць працаваць, 245 знаходзяцца на надомным абслугоўванні, 1313 чал. маюць групу інваліднасці. Цяпер штомесячна на выплату пенсій расходуецца каля 8 млн. руб.

У 1991 годзе райсабезам назначана 2439 пенсій, каля 600 пенсій пералічаны. Адзінокім грамадзянам аказана матэрыяльная дапамога на суму звыш 30 тыс. руб. і розных бытавых паслуг больш чым на 20 тыс. руб.

У мэтах узмацнення абароненасці насельніцтва раёна і, у першую чаргу, інвалідаў, малазабяспечаных непрацаздольных пенсіянераў ад негатыўных вынікаў лібералізацыі цэн выканкам вымушаны прыняць дадатковыя меры па пашырэнню натуральнай дапамогі маламаёмным слаям. Арганізавана бясплатнае харчаванне для 200 чал., выдзелена 270 пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку.

З 1.02.92 г. у магазіне «Космас» пачаўся продаж прадуктаў харчавання для адзінокіх, малазабяспечаных пенсіянераў і інвалідаў па спісах райсабеза. Праводзіцца работа па арганізацыі продажу ўцэненых тавараў для малазабяспечаных пенсіянераў.

Аднак, трэба адзначыць, што выканкам не поўнасцю яшчэ выкарыстаў магчымасці па паляпшэнню абслугоўвання данай катэгорыі грамадзян і іх сацыяльнай абароненасці.

ЗА СПРАВАЗДАЧНЫ перыяд у аддзеле ЗАГС пашырана сфера платных паслуг, аказваемых насельніцтву. Уведзены новы абрад рэгістрацыі шлюбу з удзелам беларускага фальклорнага ансамбля «Пралескі». Даход склаў 17 тыс. руб. Праведзена вялікая работа па абнаўленню інтэр'ера ў будынку аддзела ЗАГС.

Гаворачы аб умацаванні грамадскага парадку, законнасці і павышэнні адказнасці супрацоўнікаў аддзела ўнутраных спраў, трэба адзначыць, што ў раёне за прайшоўшы перыяд некалькі стабілізавалася становішча. Так, скарацілася колькасць злачынстваў па лініі ўсіх служб на 2,2%, а па лініі крымінальнага вышуку — на 4,1%. Скарацілася колькасць цяжкіх злачынстваў (на 34,4%), не дапушчана забойстваў і замахаў на чалавечае жыццё, згвалтаванняў. Дарожна-транспартных здарэнняў зменшылася на 2,9%, колькасць у іх загінуўшых — на 11,2%.

Разумеючы ўсю складанасць цяперашняй сітуацыі для праваахоўных органаў, выканкам і ў далейшым намераны садзейнічаць умацаванню гэтага звяна, аказваць пасільную дапамогу.

У бягучым годзе прынята рашэнне выдзеліць аддзелу ўнутраных спраў райвыканкама за лік перавыканання даходнай часткі бюджэту і свабодных рэшткаў бюджэтных сродкаў 720 тыс. руб. на ўтрыманне міліцыі грамадскай бяспекі. Прадугледжана таксама выдзяленне за лік непрадбачаных расходаў сродкаў у суме 50 тыс. руб. для заахвочвання супрацоўнікаў аддзела ўнутраных спраў за выкананне асабліва важных дзяржаўных заданняў.

Актывізавана работа ў справаздачным перыядзе камісіяй па справах непаўнагадовых. У 1991 г. на яе пасяджэннях разгледжана 146 спраў на 154 падлеткі. Рашэннем выканкама 22 непаўнагадовых часткова абмежаваны ў дзеяздольнасці, 4 адпраўлены на лячэнне ў псіханеўралагічную бальніцу, 3 — у спецшколы і ПТВ. За розныя правапарушэнні камісія наклала штраф на 39 непаўнагадовых і 75 аб'явіла вымову. У прайшоўшы перыяд 109 падлеткаў працаўладкавана пастаянна і 487 навучэнцаў часова ў летні час. На ўліку ў камісіі стаяць 84 «цяжкія» падлеткі, за якімі замацаваны грамадскія выхавацелі.

ВЫКАНКАМАМ праводзіцца значная работа па эстэтычнаму і маральнаму выхаванню людзей, развіццю фізічнай культуры і спорту.

У справаздачным перыядзе ў раёне функцыяніравала 25 устаноў культуры: абласны драматычны і лялечны тэатры, музей, філармонія, цырк, парк культуры і адпачынку імя Луначарскага, 2 кінатэатры, 15 культурна-асветніцкіх устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый, навучальных устаноў. Працавала 25 калектываў мастацкай самадзейнасці, у т. л. 17 са званнем «народны», 3 выставачныя залы.

Арганізоўваліся раённыя мерапрыемствы: тэатралізаваныя святы, прысвечаныя Новаму году, провадам зімы, раённыя тэматычныя вечары, прысвечаныя ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, шматдзетным сем'ям і інш. Склалася сістэма правядзення дабрачынных канцэртаў у дзіцячых і медыцынскіх установах, падшэфных гаспадарках. Пашыраецца сетка платных паслуг. Некалькі ўпарадкаваны прынцып рэгістрацыі і кантролю за дзейнасцю відэасалонаў.

Праводзіцца работа па рамонту, рэстаўрацыі і добраўпарадкаванню помнікаў гісторыі і культуры. Выкананы заказ на выраб скульптуры Чайкоўскаму каля будынка цэнтральнай дзіцячай музычнай школы № 1, якая будзе ўстаноўлена ў першым паўгоддзі г. г. Распрацавана праграма рэстаўрацыі помнікаў мясцовага значэння да святкавання 850-годдзя г. Гомеля.

У справаздачным перыядзе выканкам выдзеліў 60 тыс. руб. для развіцця мастацкай самадзейнасці Гомельскага універсітэта і 260 тыс. руб.— для арганізацыі гуртковай работы Палацу культуры бытавога абслугоўвання.

Спартыўна-масавая і фізкультурна-аздараўленчая работа ў раёне праводзіцца згодна календара спартыўна-масавых мерапрыемстваў.

У 1991 г. праведзены спаборніцтвы сярод калектываў фізкультуры прамысловых прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў па 10 відах спорту, зімовая і летняя спартакіяды дапрызыўной і прызыўной моладзі па шматбор'ю комплексу ГПА, спартакіяда сярод ЖЭК па 6 відах спорту. Пераможцы раённых спаборніцтваў удзельнічалі ў гарадскіх і абласных спаборніцтвах, а таксама ў гарадскім фестывалі народных гульняў і спартыўных захапленняў у кастрычніку 1991 г. Праведзены спартыўныя мерапрыемствы ў праграме святаў мікрараёнаў, Новага года, «Провады зімы». Аказана платных паслуг сродкамі фізічнай культуры і спорту на суму 218,7 тыс. руб.

Для заняткаў фізкультурай і спортам у раёне ёсць: 39 спартыўных залаў, плавальны басейн, 15 лыжных баз, 45 фізкультурна - аздараўленчых і абсталяваных трэнажорнай тэхнікай пакояў, 9 ціраў, 57 спартыўных пляцовак у навучальных установах, на прадпрыемствах, у зонах адпачынку і па месцу жыхарства.

У 1991 г. уведзены ў строй спартыўная зала ў СШ № 59, міні-басейн у д/с № 165. У гэтым годзе ўвойдуць у строй спартыўная зала ў інтэрнаце ВША «Камінтэрн», міні-басейн у д/с № 167, басейн у СШ № 59.

У справаздачным перыядзе з-за нестабільнасці работы прадпрыемстваў намецілася некаторае зніжэнне расходаў на фізкультуру і спорт за лік прадпрыемстваў, арганізацый раёна. Працягваецца скарачэнне метадыстаў фізічнай культуры.

Адным з важнейшых накірункаў у далейшым павышэнні масавасці фізічнай культуры і спорту жыхароў раёна з'яўляецца ўдасканаленне арганізацыі па месцу жыхарства. Аднак у сённяшні час у ЖЭК скарочаны ўсе кіраўнікі спартыўных секцый і гурткоў.

У АПАРАЦЕ выканкама ўзмоцнены кантроль за разглядам заяў, скарг і зваротаў грамадзян. За справаздачны перыяд паступіў 3391 пісьмовы зварот. З іх задаволены 2637 або 77%. Намецілася тэндэнцыя да зніжэння колькасці зваротаў грамадзян па пытаннях рамонту жылля, сантэхабсталявання, добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, забеспячэння законнасці і аховы грамадскага парадку.

По асабістых пытаннях кіраўніцтвам выканкама за справаздачны перыяд прынята 1734 чалавекі, з іх старшынёй выканкама — 516 чал., нам. старшыні выканкама і ўпраўляючым справамі — 1218 чал. У мэтах паляпшэння гэтай работы пытанні разгляду зваротаў грамадзян, арганізацыі іх прыёму рэгулярна абмяркоўваюцца на пасяджэннях выканкама.

